Установа адукацыі

«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра гісторыі Беларусі і музеязнаўства

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедрай
___________ Д.В. Герасімёнак
«___» _____________ 2020 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
___________ Ю.М. Галкоўская
«___» _____________ 2020 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# МУЗЕЙНЫ ТУРЫЗМ

па спецыяльнасці II ступені вышэйшай адукацыі 1-23 80 02
Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

Складальнік:
загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства,
кандыдат культуралогіі Д.В. Герасімёнак

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета ўніверсітэта
22.12.2020 пратакол № 3

Электронны вучэбна-метадычны комплекс складзены на аснове тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці II ступені вышэйшай адукацыі 1-23 80 02 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны рэг. № Е23-2-002/ пр-тып. ад 21.03.2019 г.

**СКЛАДАЛЬНІК:**

**Д.В. Герасімёнак**, загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

**Я.Л. Іванова**, намеснік дырэктара па лічбавым тэхналогіям і сувязях з грамадскасцю дзяржаўнай установы «Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь», кандыдат культуралогіі;

**В.М. Сакалова**, дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

(пратакол № __ ад _____.2020 г.);

Прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

(пратакол № __ ад _____.2020 г.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ


| | |
|---|---|
| 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА | 4 |
| 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ | 6 |
| 2.1 План-канспект лекцый | 6 |
| 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ | 8 |
| 3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў | 8 |
| 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ | 10 |
| 4.1 Заданні да самастойнай работы студэнтаў | 10 |
| 4.2 Пытанні да заліка | 11 |
| 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ | 13 |
| 5.1 Тэматычны план | 13 |
| 5.2 Асноўная літаратура | 15 |
| 5.3 Дадатковая літаратура | 15 |


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Актуальнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Музейны турызм» абумоўлена тым, што ў сучаснай сітуацыі музей, працягваючы заставацца некамерцыйнай установай, становіцца сацыяльным партнёрам турыстычнай індустрыі, спалучаючы філасофію асветы і тэхналогію забаўлення. У сувязі з гэтым вывучение пытанняў інтэграцыі музеяў у сусветную індустрыю турызму з’яўляецца неабходнай умовай падрыхтоўкі спецыялістаў па спецыяльнасці “Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны”.

Асноўная *мэта* вывучэння вучэбнай дысцыпліны: фарміраванне ў магістрантаў тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў аб асаблівасцях арганізацыі музейнага турызму і прыярытэтных напрамках яго развіцця.

*Задачы* вывучэння вучэбнай дысцыпліны: азнаёміць будучых спецыялістаў з сучаснымі дасягненнямі ў выкарыстанні турыстычнага патэнцыялу музеяў і прылеглых да іх тэрыторый.

Зместам вучэбнай дысцыпліны «Музейны турызм» прадугледжана фарміраванне наступнай кампетэнцыі ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі другой ступені на спецыяльнасці 1-23 80 02 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны:

Спецыяльныя кампетэнцыі:

– СК-4. Быць здольным інтэрпрэтаваць культурную спадчыну і выкарыстоўваць яе пры фарміраванні сучаснага музейнага і турыстычнага прадукту.

У выніку вывучэння дысцыпліны магістрант павінен:

*ведаць:*

– сутнасць і нацыянальныя асаблівасці развіцця музейнай справы ў Рэспубліцы Беларусь;
– сутнасць і структуру турыстычнай індустрыі, яе дасягненні на сучасным этапе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*умець*:

– аналізаваць кампаненты і асаблівасці функцыянавання турыстычнай індустрыі;
– выкарыстоўваць асноўныя прыёмы менеджменту і маркетынгу ў музейнай дзейнасці.

*валодаць*:

– навыкамі кіравання ў сферы музейнай дзейнасці;
– сродкамі эфектыўнага пошуку інфармацыі ў Інтэрнэт, выкарыстання навуковай літаратуры ў вучэбнай, навуковай і прафесійнай дзейнасці.

Пры выкладанні вучэбнай дысцыпліны «Музейны турызм» ўлічваецца яе сувязь з вучэбнымі дысцыплінамі «Актуальныя пытанні музейнай справы», «Гісторыя і метадалогія вывучэнння культурнай спадчыны», «Музеефікацыя і актуалізацыя культурнай спадчыны» і іншымі дысцыплінамі, якія служаць падмуркам у набыцці прафесійных ведаў па спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны».

У адпаведнасці з вучэбным планам, на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Музейны турызм» прадугледжана 108 гадзін, з якіх 46 – аўдыторныя. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах: лекцыі – 26 гадзін, семінарскія заняткі – 20 гадзін.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў магістрантаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 План-канспект лекцый

*Тэма 1. Уводзіны*

Паняцце і сутнасць музейнага турызму. Месца музея ў сістэме міжкультурнай камунікацыі. Асаблівасці міжкультурнай камунікацыі ў музейным турызме. Музей як аб’ект культурна-пазнавальнага турызму.

Музейны турызм як вучэбная дысцыпліна. Прадмет і задачы курса. Сувязь музейнага турызму з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.

*Тэма 2. Теарэтычныя аспекты культурна-пазнавальнага турызму*

Паняцце “культурна-пазнавальны турызм”. Класіфікацыя культурна-пазнавальнага турызму. Месца культурна-пазнавальнага турызму ў сацыяльна-культурным развіцці грамадства. Патрабаванні турыстычнай індустрыі да аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. Праблемы і перспектывы развіцця культурна-пазнавальнага турызму.

Музей у кантэксце глабальнай індустрыі турызму. Генезіс і эвалюцыя музейнага турызму. Асноўныя тэндэнцыі ўзаемадзеяння індустрыі турызму і музейнай сеткі.

*Тэма 3. Музейны турызм як напрамак музейнай дзейнасці*

Музейны турызм як спецыфічны напрамак музейнай дзейнасці. Фактары атрактыўнасці аб’ектаў музейнага турызму. Новыя музейныя тэхналогіі: музейны менеджмент, музейная камунікацыя, музейны маркетынг.

Роля менеджменту ў развіцці музейнага турызму. Метады кіравання: адміністрацыйныя, рынкавыя (эканамічныя), сацыяльна-педагагічныя, партнёрскія метады. Кіраўнічы працэс і яго функцыі. Мадэлі планавання дзейнасці музея. Стратэгічнае планаванне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прынцыпы камунікацыйнага падыходу ў дзейнасці музея. Асновы тэорыі музейнай камунікацыі. Уяўленне аб музейнай камунікацыі (К. Шэнан, М. Маклюэн, Д. Камэрон, К. Хадсан). Задачы прыкладных даследаванняў у музейнай камунікацыі. Прымяненне камунікацыйнага падыходу ў музейным турызме.

Асаблівасці маркетынгу музейнага турызму. Традыцыйныя і сучасныя канцэпцыі ў сацыяльным маркетынгу музея. Інфармацыйнае забеспячэнне музейнага турызму.

*Тэма 4. Рэсурсны патэнцыял развіцця музейнага турызму*

Асаблівасці развіцця музейнага турызму ў замежных краінах. Аналіз дзейнасці самых наведвальных турыстамі музеяў Францыі, Кітая, ЗША, Вялікабрытаніі, Расіі, Італіі і г.д. Спецыфіка выкарыстання музеяў розных профіляў (гістарычны, прыродазнаўчы, мастацкі, літаратурны, комплексны) пры фарміраванні музейных тураў.

Рэсурсы Рэспублікі Беларусь для развіцця музейнага турызму. Музейная сетка рэгіёнаў Беларусі. Музейны турызм у Беларусі на сучасным этапе. Дзейнасць беларускіх музеяў па стварэнні нацыянальнага музейнага турыстычнага прадукту. Анімацыйныя тэхналогіі ў музейным турызме. Асаблівасці прадвіжэння музейнага турызму ў Рэспубліцы Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў

### Тэма №1. Теарэтычныя аспекты культурна-пазнавальнага турызму

1. Паняцце “культурна-пазнавальны турызм”. Класіфікацыя культурна-пазнавальнага турызму.
2. Месца культурна-пазнавальнага турызму ў сацыякультурным развіцці грамадства.
3. Асаблівасці выкарыстання аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў турыстычных мэтах.
4. Спецыфіка развіцця культурна-пазнавальнага турызму ва ўмовах глабалізацыі.

### Тэма №2. Музейны турызм як напрамак музейнай дзейнасці

1. Музей ў кантэксце глабальнай індустрыі турызму.
2. Паняцце “музейны турызм”. Эвалюцыя музейнага турызму.
3. Асноўныя тэндэнцыі ўзаемадзеяння турызму і музейнай сеткі.
4. Роля менеджменту ў развіцці музейнага турызму.
5. Прымяненне камунікацыйнага падыходу ў музейным турызме.
6. Асаблівасці маркетынгу музейнага турызму.

### Тэма №3. Рэсурсны патэнцыял развіцця музейнага турызму

1. Асаблівасці выкарыстання замкаў пры арганізацыі культурна-пазнавальнага турызму.
2. Сядзібна-паркавыя комплексы як аб’екты культурна-пазнавальнага турызму.
3. Спецыфіка арганізацыі культурна-пазнавальнага турызму ў музеях пад адкрытым небам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Асаблівасці выкарыстання мастацкіх музеяў пры арганізацыі культурна-пазнавальнага турызму.

5. Спецыфіка выкарыстання гістарычных і краязнаўчых музеяў пры арганізацыі культурна-пазнавальнага турызму.

6. Патэнцыял развіцця культурна-пазнавальнага турызму ў Рэспубліцы Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ

### 4.1 Заданні да самастойнай работы студэнтаў

#### Характарыстыка рэкамендуемых метадаў выкладання

Пры арганізацыі выкладання вучэбнай дысцыпліны «Музейны турызм» рэкамендуецца выкарыстоўваць традыцыйныя формы і метады навучання магістрантаў: лекцыйныя і семінарскія заняткі, а таксама элементы самастойнай работы магістрантаў.

У лік эфектыўных педагагічных тэхналогій, якія спрыяюць развіццю ў магістрантаў крытычнага мыслення, вопыту фарміравання і выкарыстання інструментарыя вучэбна-даследчай дзейнасці, ролевага і імітацыйнага мадэлявання, магчымасці творча засвойваць новы вопыт, вылучаюцца тэхналогіі: праблемнага навучання; развіцця крытычнага мыслення; праектнага навучання; камунікацыйныя і інфармацыйныя тэхналогіі; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; метад аналізу канкрэтных сітуацый; іншыя інавацыйныя і інтэрактыўныя методыкі.

#### Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы магістрантаў

Арганізацыя самастойнай работы магістрантаў прадугледжвае падрыхтоўку магістрантамі інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, мультымедыя прэзентацый па асобных падраздзелах курса, вывучэння дадатковых крыніц і літаратуры, падрыхтоўцы да заліка і інш.

Самастойная работа магістрантаў накіравана на:

- фарміраванне навыкаў пошуку і аналізу розных відаў інфармацыі;
- засваенне, сістэматызацыю і трансляцыю атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці;
- развіццё дадатковых навукова-даследчых навыкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з'яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, падчас лекцыйных і семінарскіх заняткаў, а таксама падчас правядзення заліка.

**Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці магістрантаў**

Арганізацыя вучэбнай работы магістрантаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў да семінарскіх заняткаў па вучэбнай дысцыпліне.

Для дыягностыкі атрыманых магістрантамі ведаў прадугледжваецца выкарыстанне наступных сродкаў:

– тэставыя заданні па асобных падраздзелах і дысцыпліне ў цэлым;
– пісьмовыя работы па асобных падраздзелах дысцыпліны;
– мультымедыя прэзентацыі па асобных падраздзелах дысцыпліны;
– выступленні магістрантаў на семінарскіх занятках па самастойна падрыхтаваных тэмах.

Выніковая ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці прадугледжвае правядзенне заліка.

**4.2 Пытанні да заліка**

1. Паняцце “культурна-пазнавальны турызм”.
2. Класіфікацыя культурна-пазнавальнага турызму.
3. Месца культурна-пазнавальнага турызму ў сацыякультурным развіцці грамадства.
4. Асаблівасці выкарыстання аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў турыстычных мэтах.
5. Спецыфіка развіцця культурна-пазнавальнага турызму ва ўмовах глабалізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Асаблівасці выкарыстання замкаў пры арганізацыі культурна-пазнавальнага турызму.

7. Сядзібна-паркавыя комплексы як аб’екты культурна-пазнавальнага турызму.

8. Спецыфіка арганізацыі культурна-пазнавальнага турызму ў музеях пад адкрытым небам.

9. Асаблівасці выкарыстання мастацкіх музеяў пры арганізацыі культурна-пазнавальнага турызму.

10. Спецыфіка выкарыстання гістарычных і краязнаўчых музеяў пры арганізацыі культурна-пазнавальнага турызму.

11. Музей ў кантэксце глабальнай індустрыі турызму.

12. Паняцце “музейны турызм”. Эвалюцыя музейнага турызму.

13. Асноўныя тэндэнцыі ўзаемадзеяння турызму і музейнай сеткі.

14. Патэнцыял развіцця культурна-пазнавальнага турызму ў Рэспубліцы Беларусь.

15. Музейная сетка Рэспублікі Беларусь: агульная характарыстыка.

16. Асаблівасці развіцця музейнага турызму на сучасным этапе.

17. Анімацыйныя тэхналогіі ў музейным турызме.

18. Напрамкі папулярызацыі музейнага турызму ў Рэспубліцы Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 5.1 Тэматычны план

### Дзённая форма навучання

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | | |
| | Уводзіны | 0,5 | | | |
| 1. | Теарэтычныя аспекты культурна-пазнавальнага турызму | 5,5 | 2 | 2 | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа |
| 2. | Музейны турызм як напрамак музейнай дзейнасці | 8 | 6 | 2 | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, дыскусія |
| 3. | Рэсурсны патэнцыял развіцця музейнага турызму | 8 | 6 | 4 | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, дыскусія, падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый |
| | **Разам:** | **22** | **14** | **8** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Завочная форма навучання

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | |
| | Уводзіны | 0,5 | | |
| 1. | Теарэтычныя аспекты культурна-пазнавальнага турызму | 1,5 | 2 | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа |
| 2. | Музейны турызм як напрамак музейнай дзейнасці | 2 | 2 | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, дыскусія |
| 3. | Рэсурсны патэнцыял развіцця музейнага турызму | 2 | 2 | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, дыскусія, падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый |
| | **Разам:** | **6** | **6** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.2 Асноўная літаратура

1. Гайдукевич, Л. М. Культурно-историческое и природное наследие Беларуси : теория и практика использования в туризме / Л. М. Гайдукевич [и др.]. – Минск : Четыре четверти, 2014. – 348 с.

2. Романчук, А. В. Музейный туризм / А. В. Романчук. – СПб., 2010. – 46 с.

3. Савина, Н. В. Экскурсоведение / Н. В. Савина. – Минск : БГЭУ, 2007. – 246 с.

4. Сущинская, М. Д. Культурный туризм / М. Д. Сущинская. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : ЮРАЙТ, 2017. – 136 с.

5. Хухлындина, Л. М. Культурное наследие в туризме / Л. М. Хухлындина, Л. М. Гайдукевич. – Минск : БГЭУ, 2011. – 335 с.

## 5.3 Дадатковая літаратура

1. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь : [даведнік] / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. – Мінск : БЕЛТА, 2009. – 680 с.

2. Малахова, Н. Н. Инновации в туризме и сервисе / Н. Н. Малахова, Д. С. Ушаков. – 2-е изд., допол. и перераб. – Ростов-н/Дону : Феникс : МарТ, 2010. – 244 с.

3. Конкурентоспособность туристского комплекса Республики Беларусь : современные тенденции и вызовы : [монография] / Е. Г. Киреенко [и др.]; под общ. ред. Е. Г. Киреенко, Д. Г. Решетникова. – Минск : Ковчег, 2018. – 400 с.

4. Музеі Беларусі = Музеи Беларуси : [даведнік] / рэд. савет: Г. П. Пашкоў, Л. В. Календа, М. Г. Нікіцін; уступ. арт. А. А.Гужалоўскага. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2008. – 559 с.

5. Решетников, Д. Г. География туризма Беларуси / Д. Г. Решетников. – Минск : БГУ, 2012. – 302 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Сапанжа, О. С. Музеология : историография и методология / О. С. Сапанжа. – СПб. : Изд-во РГПУ им. А. И. Герцена, 2014. – 111 с.

7. Туризм и туристические ресурсы в Республике Беларусь, [2015-2019] : буклет / Национальный статистический комитет Республики Беларусь. – Минск, 2020. – 30 с.

8. Туристская энциклопедия Беларуси / З. Я. Андриевская [и др.]; сост.: Л. В. Ловчая, Т. И. Жуковская; под общ. ред. И. И. Пирожника. – Минск : Беларуская Энцыклапедыя, 2007. – 647 с.

9. Туристские регионы Беларуси / З. Я. Андриевская [и др.]; сост.: Л. В. Ловчая; под общ. ред. И. И. Пирожника. – Минск : Беларуская Энцыклапедыя, 2008. – 600 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ